В 2019–2020 гг., в ситуации пандемии и обусловленных ею тотальных локдаунов, в социуме только усилился запрос на организацию неформального дополнительного образования взрослых, осуществляемого онлайн-формате. Этот запрос был вызван потребностью человека ощущать себя по-прежнему включенным в социальные связи, в профессиональную и культурную жизнь. Неформальное дополнительное образование в онлайн-формате оказалось даже более широким по временнóму (проведение дистанционных занятий ранним утром или поздним вечером) и географическому диапазону (подключение к вебинарам и курсам в других странах; дистанционное участие в мастер-классах и т. д.). Все это свидетельствует о несомненных дальнейших перспективах неформального дополнительного образования взрослых в области искусства, и требует обратить пристальное внимание на подготовку или переподготовку педагогов, которым предстоит в ближайшем будущем сочетать в своей профессиональной деятельности навыки проведения офлайн- и онлайн-обучения, быть готовыми к работе в рамках формального и неформального образования, и, самое главное, оказывать педагогическое содействие обучающимся в их духовном развитии.

### Список использованных источников

1. Зиммель, Г. Избранное: Философия культуры / Г. Зиммель. – М. : Центр гуманитарных инициатив, 2017. – 432 с.

2. Торхова, А. В. Антропологические аспекты педагогического образования / А. В. Торхова // Весцi БДПУ. – 2014. – № 1. – С. 24–28.

3. Шкор, Л. А. Неинституциональные практики полихудожественного образования как педагогическое явление: исторический контекст / Л. А. Шкор, А. В. Торхова // Наука о человеке: гуманитарные исследования. – 2021. – Т. 15. – № 3.– С. 80–86.

4. Яковлева, Е. Л. Психология развития творческого потенциала личности / Е. Л. Яковлева. – М. : МПСИ, 1997. – 224 с.

5. Webber, J. Rethinking Existentialism / J. Webber. – Oxford : Oxford Univ. Press, 2020. – 256 p.



УДК [37.016:808.5]:373.3

# РЭАЛІЗАЦЫЯ ІНТЭРАКТЫЎНАГА МЕТАДУ «ЧАРОЎНЫЯ СТАНЦЫІ» ПРЫ РАБОЦЕ З КАЗКАМІ: УРОКІ ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ Ў ІІ КЛАСЕ

*А. С. Шылава,*
кандыдат педагагічных навук, дацэнт,
Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка, Рэспубліка Беларусь,
e-mail: nigr@tut.by;
*Н. У. Мурашка,*
ДУА «СШ № 196 г. Мінска», Рэспубліка Беларусь,
e-mail: m6556598@yandex.ru

Праблема фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі выклікае неабходнасць пошуку і ўкаранення новых падыходаў, якія спрыяюць эфектыўнаму засваенню ведаў і забяспечваюць дасягненне загадзя спраектаваных вынікаў.

**Ключавыя словы:** маўленча-камунікатыўная кампетэнцыя, інтэрактыўны метад «Чароўныя станцыі», казка.

The problem of the formation of communicative and speech competence at the first stage of general secondary education necessitates the search and implementation of new approaches that contribute to the effective assimilation of knowledge and ensure the achievement of pre-designed results.

**Keywords:** communicative and speech competence, interactive method «magic stations», fairy tale.

Для рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу ў навучальных праграмах І ступені агульнай сярэдняй адукацыі па вучэбным прадмеце «Літаратурнае чытанне» для агульнаадукацыйных школ з рускай мовай выхавання і навучання вызначаны набор адпаведных кампетэнцый, дзе маўленча-камунікатыўная кампетэнцыя азначана як ключавая. Адным са сродкаў яе фарміравання з'яўляюцца творы вуснай народнай творчасці: казкі, легенды, паданні, прыказкі, прымаўкі, скорагаворкі і г. д.

Разглядаючы казку як сродак фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі, трэба адзначыць, што ў ёй можна знайсці поўны пералік чалавечых праблем і вобразныя споса-

бы іх вырашэння. А выкарыстоўваючы работу над казкай разам з інтэрактыўнымі метадамі навучання на ўроках літаратурнага чытання можна дасягнуць высокіх вынікаў у фарміраванні маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў навучэнцаў.

Выдатным сродкам для работы над казкамі з'яўляецца інтэрактыўны метад, які мы назвалі «Чароўныя станцыі» [3]. У літаратуры яго часцей называюць «Крэатыўныя станцыі» [2, с. 28–31].

Мэта правядзення гэтага метаду заключаецца ў абагульненні і сістэматызацыі ведаў па раздзелу праграмы або пэўнай тэме, развіццё творчых здольнасцяў навучэнцаў, фарміраванне ўменняў працаваць у групе.

Разгледзім магчымасці рэалізацыі інтэрактыўнага метаду «Чароўныя станцыі» на ўроках літаратурнага чытання ў II класе пры абагульненні і сістэматызацыі ведаў па раздзеле праграмы «Сустрэча з казкай» [1].

Для правядзення дадзенага метаду настаўніку неабходна падрыхтаваць спецыяльнае абсталяванне і класнае памяшканне.

*Абсталяванне:* карткі з назвай чароўных станцый («Рэкламная», «Фальклорная», «Мастацкая», «Тэатральная»), папера фармату А3, фламастары, размалёўкі з выявамі галоўных герояў казак, каляровая папера, нажніцы, клей, ручкі. Колькасць станцый і іх назва па меркаванні настаўніка могуць мяняцца. У залежнасці ад гэтага можа змяняцца і абсталяванне.

Падрыхтоўка класнага памяшкання: чатыры сталы (можна злучыць некалькі парт) расстаўляюцца ў розных частках вучэбнай аўдыторыі, каб групы навучэнцаў не перашкаджалі адзін аднаму падчас работы. Кожнаму сталу прысвойваецца нумар і назва станцыі. На кожны стол раскладваюцца матэрыялы, якія адпавядаюць дзейнасці навучэнцаў на станцыі.

Пры выкарыстанні метаду «Чароўныя станцыі» на ўроках настаўнік павінен стварыць умовы для забеспячэння спрыяльнай атмасферы зносін паміж удзельнікамі групы.

*Этапы рэалізацыі метаду.*

*Першы этап.* Настаўнік складае спіс з чатырох казак, назвы якіх фіксуюцца на дошцы або на слайдзе фоне пэўнага колеру, напрыклад:



1) «Лісіца і Гусак» (жоўты колер);
2) «Хітры вол» (сіні колер);
3) «Каза-манюка» (чырвоны колер);
4) «Муха-пяюха» (зялены колер).

*Другі этап.* Настаўнік размяркоўвае навучэнцаў на чатыры групы з дапамогай выбару карткі рознага колеру: жоўтай, сіняй, чырвонай або зялёнай, якую яны бяруць са стала настаўніка. У кожнай створанай групе навучэнцы выбіраюць капітана каманды.

*Трэці этап.* Капітаны каманд выходзяць да дошкі і са стала настаўнікі бяруць адзін з пранумараваных канвертаў (№№ 1, 2, 3, 4), у якім прапісана назва казкі і чатыры заданні, якія ўдзельнікі групы павінны будуць выканаць на кожнай станцыі.

*Заданні для груп, якія неабходна выканаць на чатырох станцыях* (усе заданні подобраны з улікам узроставых асаблівасцей навучэнцаў і іх наяўных магчымасцяў):

• «Рэкламная» – назваць галоўных герояў казкі. Кожнаму ўдзельніку неабходна назваць па адным азначэнні (які ён ці яна?) для кожнага героя. Прыдумаць адно пытанне па сваёй казцы для іншых каманд.

• «Фальклорная» – падабраць да казкі адну з вывучаных раней прыказак і растлумачыць свой выбар.

• «Мастацкая» – зрабіць калаж по тэме сваёй казкі. Для гэтага трэба абраць з прапанаваных размалёвак герояў ці прадметы, якія сустракаюцца у казцы, размаляваць іх, выразаць па контуры нажніцамі і наклеіць на ліст паперы. Па жаданні групы можна падпісаць кожнага героя ці прадмет маркерамі і ўпрыгожыць калаж якімі-небудзь прадметамі, выразанамі з каляровай паперы.

• «Тэатральная» – абраць самую цікавую частку казкі і зрабіць яе міні-інсцэніроўку.

*Чацвёрты этап.* Праходжанне кожнай групай усіх чатырох станцый. Першую станцыю мэтазгодна выбраць з дапамогай жэраб'ёўкі. Час працы на кожнай станцыі – да 7 хвілін. Праз 7 хвілін пасля сігналу таймера група пераходзіць за наступны стол і выконвае заданне, якое падрыхтавана на іншай станцыі. Схема перамяшчэння груп па «чароўным станцыях» адбываецца наступным чынам:

• група «Жоўтая»: 1 станцыя – «Рэкламная» → 2 – «Фальклорная» → 3 – «Мастацкая» → 4 – «Тэатральная»;

• група «Сіняя»: 1 станцыя – «Фальклорная» → 2 – «Мастацкая» → 3 – «Тэатральная»; → 4 – «Рэкламная»;

• група «Чырвоная»: 1 станцыя – «мастацкая» → 2 – «тэатральная» → 3 – «рэкламная» → 4 – «фальклорная»;

• група «Зялёная»: 1 станцыя – «Тэатральная» → 2 – «Рэкламная» → 3 – «Фальклорная» → 4 – «Мастацкая».

*Пяты этап.* Прэзентацыя кожнай групай вынікаў сваёй дзейнасці, прадметаў сваёй творчасці (3–5 хвілін для кожнай групы).

Кожная каманда атрымлівае заданні:

• прадставіць вынікі сваёй працы на кожнай станцыі;

• задаць падрыхтаваныя пытанні па сваёй казцы ўдзельнікам іншых каманд.

Мэтазгодна, каб падчас прэзентацыі вынікаў выканання чатырох заданняў на кожнай станцыі ўдзельнічалі ўсе члены групы. Для гэтага, рыхтуючыся да прэзентацыі вынікаў сваёй дзейнасці, яны загадзя абмяркоўваюць, якое заданне, хто і як будзе прадстаўляць, вызначаюць паслядоўнасць прадстаўлення заданняў і выбіраюць навучэнцаў, якія будуць задаваць пытанні ўдзельнікам іншых каманд.

*Шосты этап.* Падвядзенне вынікаў дзейнасці, прадметаў творчасці чатырох груп на кожнай станцыі, а таксама правільнасці адказаў на пытанні, падрыхтаваныя ўдзельнікамі каманд па сваёй тэме.

Такім чынам, прапанаваны варыянт рэалізацыі інтэрактыўнага метаду навучання «Чароўныя станцыі» на ўроках літаратурнага чытання ў II класе дазваляе абагульніць і сістэматызаваць пройдзены матэрыял; стварыць умовы для фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі; атрымаць канкрэтныя практычныя вынікі навучання за кароткі перыяд часу. Акрамя таго яна стварае ўмовы для мыслення, аналізу, разважання, дзейнасці, прымянення атрыманых ведаў ў стандартных і нестандартных сітуацыях, развівае творчыя здольнасці навучэнцаў; фарміруе ў іх уменне працаваць у групе, прыносіць кожнаму з іх радасць адкрыцця, дасягненні пастаўленай мэты.



## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Антонава, Н. У. Літаратурнае чытанне : вучэб. дапаможнік для 2 кл. устаноў агульнай сэрэдняй адукацыі з рус. мовай навучання : у 2 ч. / Н. У. Антонава, І. А. Буторына, Г. А. Галяш. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021. – Ч. 1. – 136 с. : іл.

2. Интенсивное обучение: организация контроля знаний и умений обучающихся : практическое руководство / И. В. Шеститко [и др.] ; рец. В. В. Чечет. – Светлая Роща : ИППК МЧС Респ. Беларусь, 2014. – 75 с.

3. Шилова, Е. С. Технология реализации интерактивного метода «Волшебные станции» на уроках русского языка в III классе / Е. С. Шилова // Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. – 2020. – № 12. – С. 11–13.

УДК 378.046.4

# РЕАЛИЗАЦИЯ УЧЕБНОЙ ПРОГРАММЫ СТАЖИРОВКИ СПЕЦИАЛИСТОВ ДОШКОЛЬНОГО ОБРАЗОВАНИЯ В ФОРМАТЕ ОНЛАЙН

*Т. В. Щедрина,*
Белорусский государственный педагогический университет
имени Максима Танка, Республика Беларусь

Рассмотрены этапы реализации учебной программы стажировки специалистов дошкольного образования «Педагогическая песочница для познавательного развития детей дошкольного возраста» в формате онлайн.

**Ключевые слова:** познавательное развитие, дошкольное образование, стажировка, онлайн-формат.

The stages of the implementation of the training program for preschool education specialists “Pedagogical sandbox for the cognitive development of preschool children” in online format are considered.

**Keywords:** cognitive development, preschool education, internship, online format.

В последнее время приоритетными в организации дополнительного профессионального образования взрослых являются дистанционные формы обучения. С использованием различных